

ШТО ТУРБУЕ ЖЫХАРОЎ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ? 3

«ЛІСТАПАД» НАЗВАЎ ПЕРАМОЖЦАЎ 3




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІСТАПАДА 2019 г. СУБОТА № 213 (29080)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Альтэрнатывы дарожнаму збору няма, бо фінансаваць дарогі, выконваць абавязацельствы па знешніх пазыках, якія прыцягнуты на мадэрнізацыю асноўных магістраляў, за кошт сацыяльных выдаткаў не ўяўляецца магчымым. Браць сацыяльныя выдаткі, каб падтрымліваць транспартную інфраструктуру, няправільна і несправядліва ў адносінах да работнікаў бюджэтнай сферы. Гэта будзе прыводзіць адназначна да зніжэння якасці бюджэтных паслуг. Калі будзе прыняты ўказ, прапанаваны ўрадам, то агульная сума збіраемага дарожнага збору можа прыкметна вырасці».*

## КОРАТКА

• **Еўрапейскі тыдзень якасці пройдзе ў Беларусі з 11 да 17 лістапада пад дэвізам «Зробім якасць зноў вялікай!».**

• Цэнтр культуры і вольнага часу ўрачыста адкрыўся ўчора ў Глуску падчас раённага свята «Дажынкі-2019».

• **Новым галоўным трэнерам футбалістаў салігорскага «Шахцёра» стаў украінскі спецыяліст Юрый Вернідуб.**

• У Францыі ва ўзросце 68 гадоў памёр знакаміты мадэльер Патрык-Луі Вітон.




ISSN 1990 - 763X


# Крыніца на Крывінцы

ВЫТОКІ малой радзімы



Жыхаркі гарадскога пасёлка Бешанковічы **Алеся АЎЧЫННІКАВА** і **Аксана ЛЕЙЧАНКА** часта апранаюць старадаўнія мясцовыя строі, калі дэманструюць традыцыйнае народнае мастацтва на этнафальклорных фэстах і кірмашах, прадстаўляючы раённы Дом рамёстваў: Алеся — дырэктар гэтай установы, майстар па лепцы гліняных свістулек і роспісу па шкле, Аксана — майстар-метадыст па ткацтве. А іхнія святочныя строі вышытыя майстрам Аленай Пагарэльскай у 2016 годзе на ўзор жаночага адзення канца XIX — пачатку XX стагоддзя. На шчасце, яшчэ захаваліся адзінкавыя экзэмпляры ў бабуліных куфрах, у музейных запасніках.

— У такія строі местачковыя і вясковыя кабеты і дзяўчаты прыбіраліся, калі ішлі ў царкву, альбо калі танцавалі на вяселлях і вячорках, вадзілі купальскія карагоды і «жанілі Цярэшку», — кажа Алеся Аўчыннікава. — Наша майстэрня працягвае традыцыі мясцовых рамеснікаў і ўмельцаў, якія ў сваіх рукатворных работах пакінулі неацэнны скарб, у тым ліку і ў рэгіянальным жаночым адзенні. Для нас гэта — выток сапраўднай духоўнасці!

Па задуме гэтага фотапраекта, на здымку трэба паказваць і сапраўдную — чыстую, упарадкаваную і, само сабою, любімую жыхарамі крыніцу. Такой крыніцай стала «Ляснічка», якая дзень і ноч б'е з-пад крутога берага Крывінкі непадалёку ад райцэнтра. Да яе вядзе сучасная жалезная лесвіца, якая ніколечкі не парушае гармонію ціхага і ўтульнага куточка. Наадварот, прыступкі даюць уяўленне, што яны злучаюць не толькі стагоддзі, але і нашы вытокі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Патрэбныя падарункі

# ДА СВЯТА ЎСЯГО БАГАТА

**Новыя і запатрабаваная аб'екты сацыяльна-культурнага, бытавога і вытворчага прызначэнняў былі ўрачыста адкрыты па ўсёй краіне і прымеркаваны да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі, што стала ўжо добрай традыцыяй. Безумоўна, адным з самых значных падарункаў стала адкрыццё пансіяната на тэрыторыі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава ў Бараўлянах, якое на мінулым тыдні адбылося з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Жыхары Гомеля з палёгкай уздыхнулі, дзякуючы адкрыццю новага моста цераз раку Сож, а ў Мінску гэтымі днямі стаў даступны для наведвальнікаў новы басейн. Ва ўсіх рэгіёнах прайшлі вялікія і маленькія (але не з пункту гледжання значнасці для насельніцтва) адкрыцці, якія па добрай традыцыі, закладзенай яшчэ з савецкіх часоў, з'яўляюцца своеасаблівымі падарункамі для жыхароў. Якімі сёлета яны былі, можна даведацца з нашай падборкі.**

● Мінск

## «Волат» — завадчанам

Новы спартыўны аб'ект, у адкрыцці якога прыняла ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА, размешчаны ў мікрараёне Шабаны. Басейн, створаны па тыпавым праекце, змяшчае дзве чашы — для дарослых і дзяцей. Кошт аздараўленчай «абноўкі» — пяць мільёнаў рублёў. Пабудавалі басейн за 10 месяцаў з невялікім апярэджаннем тэрмінаў. «Заводскі раён — гэта адзін з буйных, дзе жывуць 234 тысячы чалавек. Канечне, тут павінна быць развітая інфраструктура. І мы бачым, што ў гэтым раёне шмат жылля пабудавана, пражывае вялікая колькасць людзей, але не было такога спартыўнага аб'екта.

СТАР. 2

На краі свету

# АНТАРКТЫДА ЧАКАЕ... БЕЛАРУСАК

### Але яны пакуль туды не імкнуцца



**Дванаццатая беларуская антарктычная экспедыцыя адправілася на ледзяны кантынент самалётам з Мінска ў Кейптаўн і далей мясцовымі антарктычнымі рэйсамі да беларускай базы, размешчанай каля гары Вячэрняй. А напярэдадні адбыліся ўрачыстыя провады беларускіх палярнікаў у Нацыянальнай акадэміі навук.**

**Упершыню на Паўднёвы полюс Зямлі адпраўляецца адразу дзесяць беларусаў. Сярод іх ёсць як бывалыя палярнікі (іх роўна палова), так і навічкі. Напрыклад, Аляксей ЗАХВАТАЎ (інжынер-механік па эксплуатацыі транспартных сродкаў і сродкаў механізацыі) з'яўляецца ўдзельнікам трох беларускіх экспедыцый. Аляксей ХАТКЕВІЧ (інжынер-будаўнік, механік дызель-электрастанцый, каардынуе ўсе тэхнічныя службы антарктычнай станцыі) удзельнічаў ужо ў дзвюх экспедыцыях, як, дарэчы, і Павел ШАБЛЫКА — інжынер-геафізік (зараз яму 29 гадоў, а падчас першай было ўсяго 24).**

СТАР. 4

# ВЕНСКІ НАПРАМАК

## На наступным тыдні Аляксандр Лукашэнка наведае Аўстрыю з афіцыйным візітам

**На 12 лістапада ў Вене запланаваны перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з федэральным прэзідэнтам Аўстрыі Аляксандрам Ван дэр Беленам у вузкім і пашыраным складзе.**

Лідары краін абмяркуюць працяг гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, якое ўжо знаходзіцца на досыць высокім узроўні. У цэнтры ўвагі будуць і палітычныя пытанні: сітуацыя ў рэгіёне і свеце, узаемадзеянне Беларусі з Еўрасаюзам, у тым ліку ў фармаце «Усходняга партнёрства», тэматыка аховы навакольнага асяроддзя.

Прэзідэнт Беларусі ў Вене правядзе таксама перагаворы са старшынёй Нацыянальнага савета Аўстрыі Вольфгангам Саботкам. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка ў фармаце рабочай вячэры правядзе сустрэчу са старшынёй Аўстрыйскай народнай партыі, дэпутатам Нацыянальнага савета Аўстрыі Себасцьянам Курцам.

Адначасова з візітам кіраўніка дзяржавы ў Вене будзе праходзіць аўстрыйска-беларускі бізнес-форум, у якім прымуць удзел дзелавыя колы двух краін, у тым ліку прадстаўнікі буйнога бізнесу.

Падчас афіцыйнага візіту ў Аўстрыю запланавана падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў і бізнес-пагадненняў аб развіцці супрацоўніцтва па розных кірунках, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

# УСХОД ПА-САПРАЎДНАМУ БЛІЗКІ

## Прэзідэнт абмеркаваў ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва і праекты ў сферы штучнага інтэлекту з кіраўніцтвам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў

**Аляксандр Лукашэнка ў ААЭ сустрэўся з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Пра гэта паведаміла прэс-служба Прэзідэнта.**

Падчас сустрэчы абмяркоўваўся ход рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых па выніках нядаўняга візіту наследнага прынца ў Беларусь, вызначаны далейшыя крокі па іх выкананні. Беларускі лідар адзначыў аператыўнае накіраванне дэлегацыі эмірацкіх дзелавых колаў у Беларусь, што сведчыць аб рэальнай зацікаўленасці ААЭ ў развіцці гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Прэзідэнт запэўніў у максімальным садзейнічанні эфектыўнаму вырашэнню магчымых пытанняў.

Бакі абмеркавалі ўзаемадзеянне ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, банкаўскай справе, лагістыцы, гуманітарнай сферы. Асобная ўвага ўдзелена супрацоўніцтву ў галіне спорту. Лідары двух краін падрабязна абмеркавалі сітуацыю ў рэгіёне Блізкага Усходу і ў глабальным кантэксце.

Адным са складнікаў двухбаковых адносін з'яўляецца ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. У гэтым плане заяўлена аб гатоўнасці да пашырэння дыялогу па кірунках, якія цікавяць эміраці бок, у тым ліку ў галіне навуковых даследаванняў, навучання, правядзення сумесных трэніровак, абмену вопытам.

Таксама кіраўнік Беларусі сустрэўся з саветнікам па нацыянальнай бяспецы ААЭ шэйхам Тахнунам бен Заідам аль-Нахаянам. На сустрэчы абмеркаваны праекты, якія ўжо рэалізуюцца, і перспектыўныя сумесныя, у тым ліку ў сферы штучнага інтэлекту, яго прымянення ў розных сферах.

Беларускі лідар падкрэсліў, што прапанова азнаёміць беларускую дэлегацыю з узроўнем развіцця штучнага інтэлекту ў ААЭ заслугоўвае асаблівай павагі. «Бо гэта сфера пакуль што даволі закрытая. Кожная краіна, калі яна займаецца штучным інтэлектам, скрывае вынікі гэтага тварэння адна ад адной. Вы праяўляеце найвышэйшую адкрытасць, і мы гэта вельмі цэнім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама былі абмеркаваны вынікі сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з наследным прынцам Абу-Дабі шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Бакі адзначылі яе прадукцыйнасць і абсалютную нацэленасць на аператыўную рэалізацыю ўсіх намечаных планаў.

# ДА СВЯТА ЎСЯГО БАГАТА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калісьці, адкрываючы спартыўны комплекс «Мандарын» (размешчаны ў Заводскім раёне. — «**Зв.**»), кіраўнік краіны паставіў задачу — у горадзе Мінску пабудаваць як мага больш басейнаў, каб у людзей была магчымасць займацца спортам і проста прыйсці паплаваць, — сказала Наталля Качанава. — І я ўпэўнена, што аб'ект будзе карыстацца папулярнасцю ў жыхароў раёна. Тут усё зроблена для таго, каб чалавек мог прыйсці паплаваць і атрымаць ад гэтага задавальненне».

Па словах Наталлі Качанавай, будаўніцтва басейнаў у горадзе будзе працягвацца. І аб'ект у Шабанах — прыклад таго, як гэта павінна адбывацца: за непрацяглы тэрмін і невялікія грошы.

Спартыўны аб'ект дапрацавалі адпаведнай інфраструктурай — паркоўкай, пад'язнымі шляхамі. Побач размясцілася зона адпачынку з трэнажорамі і пляцоўкай для воркаута.

### ● Брэстчына

### Новая вытворчасць — новыя лыжы

У Целяханах урачыста адкрылі новы цэх па вытворчасці пластыкавых лыжаў. Гэта стала чаканай падзеяй для Целяхан і навакольных вёсак. Фабрыка даўно была градаўтваральным прадпрыемствам для амаль 5-тысячнага пасёлка. Зараз на гэтай вытворчасці працуе больш за 180 чалавек. А праведзеная мадэрнізацыя дае надзею на далейшае пастаўнае развіццё прадпрыемства і стварэнне дадатковых рабочых месцаў.

Новую вытворчасць стварылі ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы фактычна за год. Рэалізацыя праекта абышлася ў 14 мільёнаў беларускіх рублёў. Была праведзена рэканструкцыя будынка, завезена абсталяванне ад вядучых айчынных і замежных вытворцаў для ўсяго цыкла вытворчасці сучасных пластыкавых лыжаў.

Ужо ў наступным годзе плануецца выпусціць 50 тысяч пар, а да 2022 года выпуск узрасце да 100 тысяч пар у год. Праект па вытворчасці пластыкавых лыжаў змаглі ажыццявіць з дапамогай вучоных. На гэты факт звярнуў увагу прысутных падчас адкрыцця кіраўнік спраў Прэзідэнта Віктар ШЭЙМАН:

— Была праведзена велізарная работа спецыялістамі Акадэміі навук, Нацыянальнага тэхналагічнага ўніверсітэта, а таксама Кіраўніцтва справамі, міністэрстваў спорту і прамысловасці. Давялося выязджаць у Кітай, Аўстрыю, Расію для вывучэння вопыту. Мы здолелі выпусціць лыжы, якія не ўступаюць расійскім альбо ўкраінскім.



### ● Віцебшчына

### Для падрыхтоўкі машынабудаўнікоў

У Аршанскім дзяржаўным механіка-эканамічным каледжы, дзе вучыцца каля 800 чалавек, пачаў працаваць рэсурсны цэнтр машынабудаўнічага профілю. На сённяшні дзень у Віцебскай вобласці аналагаў гэтай адукацыйнай установе няма. А сярод такіх жа ў краіне па тэхнічным забеспячэнні адной з найлепшых. У рэсурсным цэнтры ёсць лабараторны корпус, механічныя майстэрні фрэзернай і такарнай апрацоўкі матэрыялаў на малагабарытных станках з праграмным кіраваннем. Таксама абсталявалі майстэрню фрэзернай і такарнай апрацовак матэрыялаў на прамысловых інтэлектуальных станках.

Лабараторыі і майстэрні аснашчаны сучасным вучэбным абсталяваннем як айчынным, так і замежным вытворчасці.

Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА адзначыў, што такія ўстановы дазваляюць рыхтаваць спецыялістаў, якія адпавядаюць патрэбам часу. Кіраўнік ведамства выказаў упэўненасць, што «начынне» цэнтра самае перадавое. І цяпер у Беларусі — у трэндзе арганізацыя навучання ва ўстановах, дзе магчыма стаць майстрам сваёй справы яшчэ да пачатку работы.

### ● Гомельшчына

### Жыллё для калійшчыкаў

У Петрыкаве 5 лістапада здалі два 60-кватэрныя арэндныя дамы.

Яны прызначаны для работнікаў Петрыкаўскага горна-ўзбагачальнага камбіната. Інфраструктура будучага прадпрыемства ствараецца разам з самым маштабным інвестпраектам ААТ «Беларуськалій».

У пяціпавярховіках па 30 аднапакаёвых кватэр, 16 — двухпакаёвых і 14 — трохпакаёвых. Кватэры здадзены з поўным аздабленнем, індывідуальнымі газавымі ацяпляльнымі катламі, прыборамі ўліку вады і электраэнергіі, газавымі лічыльнікамі. Побач з кожным домам ёсць паркоўкі на 16 машынамесцаў і велапаркоўкі. Добраўпарадкавана і дваровая тэрыторыя.

Да канца года ў Паўночным мікрараёне плануюць здаць інтэрнат для іншагародніх работнікаў горна-ўзбагачальнага комплексу. Налета намечана будаўніцтва 40-кватэрнага дома і дзіцячага садка на 240 месцаў.

### ● Гродзеншчына

### Аб'екты — дзецям

Дзіцячы яслі-сад у Лідзе ўрачыста адкрылы з удзелам памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Івана ЛАЎРЫНОВІЧА, старшыні КДК Беларусі Леаніда АНФІМАВА, іншых ганаровых гасцей і прадстаўнікоў мясцовай улады. Такое шырокае прадстаўніцтва абумоўлена, у першую чаргу, значнасцю аб'екта, які адразу назвалі сучасным цэнтрам для развіцця і выхавання дзяцей. Тут абсталяваны музычны, спартыўны, трэнажорны залы, басейн. Ёсць сэнсарны пакой і нават камп'ютарны клас. Дашкольная ўстанова разлічана на 230 месцаў. Гэта новы трохпавярховы шматкорпусны будынак з вялікай абсталяванай пляцоўкай па ўсім перыметры. На будаўніцтва выдаткавана з абласнога бюджэту пяць мільёнаў рублёў.

Неабходны для дзяцей аб'ект з'явіўся і ў мікрараёне Альшанка абласнога цэнтра — новая дзіцячая амбулаторыя. Установа размясцілася на першым паверсе шматпавярховіка і зможа прыняць да 70 пацыентаў у змену. Гэта ўдвая больш, чым існучая. Аб'ект каштаваў бюджэту больш за мільён рублёў, тут ёсць нават уласная гемалабараторыя.

### ● Магілёўшчына

### Мост, арэна і станцыя абезжалезвання

Жыхары Глуска, напрыклад, атрымалі замест старога кінатэатра сучасны цэнтр культуры і вольнага часу «Арыён». Менавіта ў гэты дзень тут святкаваліся раённыя «Дажынкі». Жыхары райцэнтра таксама ацанілі якасць абноўленай спартыўнай арэны на месцы былога стадыёна. Замест старых лавак тут з'явіліся зручныя крэслы на 600 месцаў, зроблена сучаснае асвятленне, узведзена агароджа, заменены ўваходныя вароты і тратуарная плітка.

У Хоцімску запрацавала новая лінія хлебабулачных вырабаў ад мясцовай райспажыўкааперацыі. Жыхары аграгарадка Ціманава Клімавіцкага раёна далучыліся да чыстай вады. Напярэдадні свята тут урачыста запусцілі ў работу станцыю абезжалезвання. У Крычаўскім раёне да 7 лістапада прымеркавалі адкрыццё дзіцячага садка ў мікрараёне «Сож». У гэтыя ж святочныя дні адкрыўся рух транспарту цераз мост па цэнтральнай вуліцы Першамайскай у Магілёве, які амаль два месяца знаходзіўся на рэканструкцыі.

### ● Міншчына

### Вытворчая лінія і інтэрнат

На ААТ «БелАЗ» пачала працаваць новая лінія па афарбоўцы дэталяў і вузлоў кар'ернай тэхнікі. Запуск новай лініі дасць магчымасць павысіць якасць пакрыццяў выпускаемай прадукцыі, павялічыць тэрмін іх службы да 7—10 гадоў, а таксама знізіць аб'ём выкідаў у навакольнае асяроддзе. Як адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, які прыняў удзел у адкрыцці, у праект інвеставана 35 мільёнаў рублёў. Запуск новай лініі ўключаны ў маштабную праграму комплекснай мадэрнізацыі, якая прадугледжвае як тэхнічнае пераўзбраенне, так і паляпшэнне ўмоў працы і адпачынку завадчан. Дзякуючы мадэрнізацыі створана 300 высокатэхналагічных рабочых месцаў, палепшаны бытавыя ўмовы для 700 супрацоўнікаў прадпрыемства.

А ў Салігорску ўрачыста адкрылі першую чаргу завода па вытворчасці нітрату калію. Гэта першы сумесны праект ААТ «Беларуськалій» і кітайскай кампаніі Migao Corporation Limited. З 1 кастрычніка завод перайшоў на кругласутачны зменны рэжым работы. Гадавая магутнасць першай чаргі новага завода складзе 80 тысяч тон нітрату калію і 62 тысячы тон гранулюваных азотна-калійных угнаенняў. Плануецца, што прадукцыя будзе экспартавацца ў краіны Еўрасаюза, Турцыю і Расію, а таксама ў Кітай, што прадугледжана падпісаным з кампаніяй асобным пагадненнем.

У аграгарадку Прылукі Мінскага раёна адкрыўся інтэрнат для навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, пабудаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі яго адкрыцця прынялі намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА і міністр культуры Юрый БОНДАР. Інтэрнат разлічаны на 240 чалавек.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Марыя ДАДАЛКА, Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. Фота БелТА.**

Блізкая ўлада

Уладзімір КРАЎЦОЎ:

# «Сумесна мы можам зрабіць больш»

## Старшыня Гродзенскага аблвыканкама падчас асабістага прыёму грамадзян выслухаў калектыўныя звароты жыхароў горада і раёна

**Група жанчын прыехала на прыём з аграгарадка Верцялішкі Гродзенскага раёна. Яны жывуць на вуліцы Працоўнай, частка якой не мае водаправода і каналізацыі. Да таго ж заяўніцы звярнулі ўвагу на дрэнны стан самой вуліцы — няма асфальту і тратуара. Але перш чым добраўпарадкаваць вуліцу, трэба вырашыць праблему водазабеспячэння. Бо інакш давядзецца зноў «падымаць» асфальт.**

**У райвыканкаме падлічылі, што на тое, каб прывесці вуліцу ў парадак, трэба 650 тысяч рублёў.**



Фота БелТА.

Пытанне па вадзе вырашальнае, ёсць і праект, але не ўсе жыхары здольны ўзяць на сябе выдаткі па пракладцы водаправода. Як паведамілі жанчыны, большасць жыхароў вуліцы — пенсіянеры, і для іх гэта непад'ёмна. Падлічана, што на пракладку водаправода для 80 дамоў трэба 250 тысяч рублёў. Раённыя ўлады паведамілі, што частку выдаткаў па земляных работах можа ўзяць на сябе мясцовая гаспадарка «Прагрэс — Верцялішкі». А вось падключэнне — за свой кошт. На думку Уладзіміра Краўцова, трэба шукаць кампрамісныя варыянты, у якіх задзейнічаны і дзяржава, і самі жыхары. Тым больш што ім даецца растэрміноўка выплат на год.

— Канешне, людзі хочуць жыць камфортна, і задача ўлады — рэалізоўваць гэтыя пажаданні. На ўсё, вядома, грошай не хапае, але дзяржава ідзе насустрач, знаходзіць такія нормы, каб сумесна з насельніцтвам вырашаць надзённыя пытанні, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. — Як паведамілі жыхаркі аграгарадка, многія гатовы пайдзельнічаць у фінансаванні работ. Адзінокім, безумоўна, гэта складана зрабіць. Але ім могуць дапамагчы, напрыклад, сацыяльныя службы альбо прадпрыемствы, дзе яны працавалі. Сумесна мы значна больш і хутчэй зможам зрабіць — і водаправод правесці, і каналізацыю, і газ. Дарэчы, па газе такі вопыт напрацаваны, удзел жыхароў у фінансаванні работ прадугледжаны адпаведным указам. Менавіта па такой схеме газіфікавана большая частка нашых аграгарадкоў.

Яшчэ адно набалелае пытанне агучылі прадстаўнікі садовага таварыства «Хімік Азот». Дарэчы, улады добра ведаюць гэтую праблему, якая востра паўстала некалькі месяцаў таму. Справа датычыцца зносу ўчасткаў, якія рашэннем гарвыканкама прызнаны самавольна занятымі і знаходзяцца ў паласе інжынерных камунікацый ААТ «Гродна Азот».

Між тым гісторыя бярэ пачатак яшчэ з 70-х гадоў, калі і было сфарміравана садовае таварыства завода-гіганта. Участкі для яго работнікаў выдзяляліся непадалёк ад самога прадпрыемства. Такім чынам з'явілася каля тысячы надзелаў. І мясцовыя ўлады, па словах заяўніка, замацавалі гэтыя землі за садовым таварыствам. Але замест агародніцтва вырас цэлы дачны пасёлак. З удасканальваннем зямельнага заканадаўства неабходна было гэтыя ўчасткі ўзаконіць. Больш за 350 дач такога дазволу не атрымалі, бо знаходзіліся ў ахоўнай зоне. Сітуацыя пагоршылася пасля прарыву цеплатрасы. Паўстала праблема бяспекі. І цяпер завод ставіць пытанне аб ліквідацыі амаль 100 участкаў, з якіх палова маюць будынкі.

— У гэтай праблемы свая гісторыя, якую трэба вырашаць, бо людзі не мелі мэты захапіць зямлі, ім выдзяляліся ўчасткі, каб яны маглі забяспечыць сябе агароднінай. Тым больш тут была пустка. Горад і траса былі за межамі прадпрыемства, а зараз гэта гарадская тэрыторыя, траса знаходзіцца побач. А хутка будзе яшчэ адна. Для гэтага пройдзе рэканструкцыя былога чыгуначнага моста пад аўтамабільны, каб звязаць мікраёны горада з трасай М6 і «Гродна Азотам». І пад гэта трэба вызваліць тэрыторыю, — патлумачыў старшыня аблвыканкама.

Разам з тым кіраўнік рэгіёна не здымае адказнасці з самога прадпрыемства. Не ўсё было зроблена правільна з юрыдычнага пункту гледжання пры раздачы ўчасткаў. Таму цяпер трэба разбірацца з кожным індывідуальна. Існуе пэўны крытэрый канфіскацыі маёмасці пад дзяржаўныя патрэбы. Напрыклад, пры будаўніцтве трасы ўласнікам будзе выплачана адпаведная кампенсацыя. Калі тэрыторыя адводзіцца пад патрэбы завода, прадпрыемства павінна паклапаціцца аб вырашэнні гэтай праблемы. Тым больш што справа датычыцца замены існуючых інжынерных сетак пад будаўніцтва новага комплексу завода.

— Прынята рашэнне будаваць новы азотны комплекс, інвестыцыі ў які складуць мільярд долараў. Сёлета павінны вызначыць генеральнага падрадчыка, а ў канцы будучага года плануецца распачаць работы, — паведаміў Уладзімір Краўцоў. — Па папярэднім разліку, неабходна пабудаваць новыя сеткі з забором вады з Нёмана, і яны праходзяць таксама па дачных участках. Таму трэба будзе разабрацца з дачамі, якія знаходзяцца ў гэтай зоне. Гісторыя няпростая, таму мяркуем падключыць рэспубліканскія ведамствы, архівы, атрымаць кансультацыю і рэкамендацыі з такім разлікам, каб рабіць па справядлівасці і не крыўдзіць людзей.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

# ГРУЗІНЫ І БЕЛАРУСЫ Ў ФАВОРЫ:

## «Лістапад» назваў пераможцаў

**Адразу тры ўзнагароды Мінскага міжнароднага кінафестывалю адышлі беларускаму дакументалісту Андрэю Куцілу, Кшыштаф Занусі атрымаў прыз Прэзідэнта «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве», а польская карціна «Цела Божае» стала найлепшым ігравым фільмам з пункту гледжання гледачоў.**



Кадр з фільма «Атлантыда».

Учора ў кінатэатры «Масква» на ўрачыстай цырымоніі закрыцця былі падведзены вынікі кінафестывалю «Лістапад». Найлепшай ігравой работай Нацыянальнага конкурсу стала кароткаметражка «Пляж/лес/тамбур» Кірыла Галіцкага і Святланы Казлоўскай, у анімацыі перамагла карціна Алены Пяткевіч «Магістр вольных мастацтваў Францыск Скарына», а ў дакументалістыцы — фільм Summa Андрэя Куцілы.

Апошні ўганараваны таксама прызам Гільдыі кіназнаўцаў і кінакрытыкаў, а другая работа рэжысёра «Стрыптыз і вайна» атрымала Спецыяльны прыз журы ў Асноўным конкурсе дакументальнага кіно «Лістапада». Гран-пры за найлепшы дакументальны фільм у гэты час адышоў кітайскай карціне «Наша машына часу» Яна Суня і С. Леа Чыана.

Найлепшым у конкурсе «Маладосць на маршы» быў названы ўдзельнік з Аўстрыі «Ліліан» Андрэаса Хорвата. Гэты ж фільм сваёй узнагародай адзначыла і журы Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў FIPRESCI. Прыз глядацкіх сімпатый апроч «Цела Божага» атрымала дакументальная карціна «Эйфарыя быцця» Рэкі Саба з Венгрыі, а ў конкурсе фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» — нямецкая работа «Рока змяняе свет» Каці Бенрат.

Як прыз за найлепшую мужчынскую ролю, так і прыз за найлепшую жаночую ролю атрымалі акцёры грузінскіх фільмаў — адпаведна Леван Гелбахіані з «А потым мы танцавалі» і Саламе Дзямурыя з карціны «Удых-выдах». За найлепшую аператарскую работу ў Асноўным конкурсе ігравога кіно быў адзначаны Кім Хён Сок за кітайскі фільм «Бывай, сын мой», за найлепшы сцэнарый — стужка «Злачынны чалавек» Дзмітрыя Мамуліі (зноў Грузія), за найлепшую рэжысуру — польскае «Цела Божае» Яна Камасы, а таксама Спецыяльны прыз журы.

І нарэшце. Гран-пры «Залата Лістапада» за найлепшы фільм атрымала украінская антыўтопія Валянціна Васяновіча «Атлантыда».

Поўны спіс пераможцаў можна знайсці на афіцыйным сайце кінафестывалю listapad.com, некаторыя ўдзельнікі сёлетняга фестывалю будуць выходзіць у мінскі пракат.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

Парламенцкі дзённік

# ДОБРЫЯ СУСЕДЗІ І ДЗЕЛАВЫЯ ПАРТНЁРЫ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Эйнарсам СЕМАНІСАМ.**

Паслом у нашу краіну спадар Семаніс быў прызначаны сёлета ў пачатку жніўня. Да гэтага ён прадстаўляў Латвію ў Літве, Мальтыйскім ордэне, Ватыкане, Польшчы, Фінляндыі, Балгарыі, Кітаі, ЗША.

— Мы ведаем, што ў вас ужо вельмі вялікі вопыт дыпламатычнай работы і ў суседніх з Рэспублікай Беларусь дзяржавах, і ў далёкім замежжы. Разлічваем, што і ваш вопыт, і наша актыўная работа дазволяць выпрацаваць новыя кірункі супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі, — сказаў, вітаючы госця, Уладзімір Андрэйчанка. — Мы зацікаўленыя, каб супрацоўніцтва ўмацоўвалася ў далейшым, былі ўзаемапаразуменне, давер, і не толькі паміж Беларуссю і Латвіяй, але ў цэлым у нашым рэгіёне.

У апошні час значна актывізаваліся міждзяржаўныя, парламенцкія кантакты, адзначыў спікер і выказаў упэўненасць, што будучы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Латвію надасць сур'ёзны імпульс нарошчванню двухбаковых адносін.

Што датычыцца парламенцкага супрацоўніцтва, то яно развіваецца не толькі на двухбаковай аснове, але і на міжнародных пляцоўках, дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. У гэтай сувязі ён нагадаў пра сумесную работу над рэзалюцыямі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ і прапанаваў працягнуць такую практыку, бо яна спрыяе ўсталяванню даверу паміж краінамі і бяспецы ў рэгіёне.

«Нам трэба актыўна выкарыстоўваць і пляцоўку Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора. Мы зацікаўленыя атрымаць там статус назіральніка», — заявіў беларускі парламентарый. Пры гэтым ён са шкадаваннем заўважыў, што пакуль не адбылося сустрэчы на ўзроўні кіраўнікоў парламентаў, і выказаў надзею, што падчас місіі спадара Семаніса ў Беларусі гэта «недарэчнасць будзе выпраўленая».

Стратэгічным пытаннем для абедзвюх краін Уладзімір Андрэйчанка назваў супрацоўніцтва ў транспартна-транзітнай сферы. «Думаю, дэпутатам трэба актыўна падтрымліваць праекты, выгадныя Латвіі і Беларусі», — выказаў думку старшыня ніжняй палаты беларускага парламента.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Надвор'е

# КРЫХУ ПАХАЛАДАЕ, І ЗНОЎ ЦЯПЛО

**У гэтыя суботу і нядзелю на тэрыторыі краіны будзе назірацца выключна дажджлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Дзесьці будуць кароткачасовыя, месцамі моцныя лівні, але ў асноўным неба зацягне шэрымі хмарамі, якія будуць павольна паліваць нас восеньскім цёплым дажджом.**

У суботу ўмовы надвор'я ў краіне будуць фарміравацца пад уздзеяннем атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з тэрыторыі Украіны. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі нашай краіны кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень парывісты. Максімальная тэмпература ўдзень ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, у паўднёвых раёнах — 13—15 цяпла.

Будзе адносна цёпла і ў нядзелю. Амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца туман. У цёмны час сутак слупок тэрмометра апусціцца да 4 — 11 градусаў з плюсам, удзень паднімецца да 9 — 15 градусаў цяпла. У панядзелак удзень стане на некалькі градусаў халадней. Але ў аўторак да нас зноў заветае вільготнае паветра з Атлантыкі і пацяплее.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Паводле звестак сэрвісу папярэдніх прагнозаў, істотнае пахаладанне чакаецца ў Беларусі толькі бліжэй да пачатку снежня. Толькі на тыдні з 25 лістапада да 1 снежня сярэднясутачная тэмпература паветра ў Мінску наблізіцца да нуля.

Сяргей КУРКАЧ.

# АНТАРКТЫДА ЧАКАЕ... БЕЛАРУСАК

## Даць фору маладым

Але самыя вопытныя палярнікі — гэта нязменны кіраўнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый, пачынаючы з 2007 года, **Аляксей ГАЙДАШОЎ і інжынер-эколаг, кандыдат біялагічных навук Юрый ГІГІНЯК.** Агульны стаж работы Аляксея Гайдашова за пяцідзесятым градусам паўднёвай шыраты складае ўжо каля 11 гадоў. Першая яго экспедыцыя ў 1988 годзе доўжылася больш за год. А Юрый Гігіняк упершыню трапіў у круглагадовую экспедыцыю ў Антарктыку ў далёкім 1970 годзе. Затым ён тройчы ўдзельнічаў ужо ў беларускіх сезонных экспедыцыях, дзе прадстаўляў біялагічную навуку Нацыянальнай акадэміі навук. Ён першы і адзіны беларускі навуковец, які абараніў дысертацыю па антарктычнай тэме. І гэта будзе ўжо яго чацвёртая экспедыцыя на Паўднёвы полюс. Яго невыпадкова лічаць легендарнай асобай — Юрыю Рыгоравічу пайшоў 74-ы (!) год.

— Мы кожны год «закручваем гаечкі» пры праходжанні розных фільтраў для будучых палярнікаў — фізічных і псіхалагічных. І гэты год паказаў, што ёсць праблемы. У прыватнасці, трое з чатырох забракаваных прэтэндэнтаў — маладыя навуковыя супрацоўнікі. І яшчэ аднаго кандыдата мы спадзяваліся ўзяць з сабой у якасці кухара, — патлумачыў Аляксей Гайдашоў. — Яго прысутнасць вызвалiла б час у спецыялістаў, якія займаюцца рэалізацыяй навуковых праграм і тэхнічным забеспячэннем жыццядзейнасці станцыі. Юрый Гігіняк быў уключаны ў экспедыцыю замест свайго маладога калегі, які не прайшоў медыцынскі адбор, але з пэўнымі абмежаваннямі і пад маю асабістую адказнасць. Мы яго накіруем на круглагадовую расійскую станцыю, дзе ёсць стацыянарны медыцынскі блок. Да таго ж ён вязе абсталяванне для навуковых даследаванняў, якое шмат важыць, а ў нас сёлета змянілася лагістыка.

## У спартанскіх умовах

Упершыню ў пачатку сезона ў раён базіравання беларускай антарктычнай станцыі судны заходзіць не будуць. Гэта накладае пэўны адбітак на падрыхтоўку і правядзенне сезонных работ, якія будуць працягвацца каля пяці месяцаў. «Мы можам даставіць туды малой авіяцыяй на адлегласць 1400 кіламетраў груз вельмі абмежаванай вагі. А генеральны груз прыйдзе ў канцы сакавіка, у тым ліку чарговыя канструкцыі Беларускай антарктычнай станцыі. І ў нас будуць лічаныя дні, каб усё змантыраваць, да таго як мы пакінем нашу базу. Таму давядзецца працаваць у яшчэ больш спартанскіх умовах».



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тым не менш задачы пастаўлены вялікія (як навуковыя, так і інжынерна-тэхнічныя), і ўсе іх трэба выканаць.

«На нашай станцыі заўсёды застаецца пэўны запас прадуктаў, не хвалюйцеся за нас, — заспакойвае Аляксей Гайдашоў. — Скажу вам па сакрэце, што крупы, згушчонка і тушонка не псуюцца. А з Вялікай зямлі мы плануем узяць з сабой толькі прадукты глыбокай замарозкі. Запасы паліва і запчастак там таксама ёсць».

«А вы, калі пакідаеце станцыю, замок вешаеце?» — пацікавіўся жартам першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей Чыжык. «Замкі ў Антарктыдзе не патрэбныя, там нікто не возьме чужое — гэта святое, але па нашай ментальнасці мы ўсё роўна гэта робім», — адказаў шчыра старшыня экспедыцыі. «А жонкі ўсіх адпусцілі ў Антарктыду?» — задаў чарговае пытанне адзін з кіраўнікоў акадэміі. І пачуў адказ, які ўсе сустрэлі смехам: «А яны яшчэ не ўсе ведаюць...»

Цікава, што дарога ў Антарктыду не закрытая і для жанчын. Ва ўсялякім выпадку, так сцвярджае начальнік экспедыцыі. І дадае, што чаргі з прадстаўніц прыгожага полу на конкурсны адбор ён не заўважыў, хоць ніякіх забарон няма — на нашай станцыі нават прадугледжаны дзве асобныя кабінкі ў прыбіральні. Жанчыны працуюць у многіх міжнародных экспедыцыях, у тым ліку расійскай: хімікамі, біёлагамі, медыкамі... Дык чаму б не замахнуцца на Паўднёвы полюс і беларускам?

## Паскардзіцца... айсбергу

У найбліжэйшыя гады стане актуальным пытанне камплектавання круглагадовых экспедыцый у Антарктыку. Мяркуецца, што першая распачнецца ў снежні 2020-га ці ў студзені 2021 года. Зімоўка — гэта існаванне ў прынцыпова іншым фармаце. Не толькі ў плане кліматычных умоў. Калі ў прыбярэжнай частцы Антарктыды надыходзіць палярная ноч, тэмпература паветра можа апускацца да мінус 60 градусаў. А падчас палярнага лета, калі там працуюць беларускія палярнікі, яна вагаецца ад +3 да -28 градусаў. Да таго ж у лютым спыняюцца авіязносіны, а ў сакавіку-красавіку завяршаецца марскі рух у зоне базіравання нашай станцыі. Фактычна восем месяцаў у год любыя транспартныя сувязі з Вялікай зямлёй адсутнічаюць.

— Надвор'е нас не пужае, — запэўнівае Юрый Гігіняк. — Калі вельмі холадна, палярнік проста апранаецца цяплей. А калі зусім невыносна — не выходзіць на адкрытае паветра. А вось псіхалагічная несумяшчальнасць можа стаць сур'ёзнай праблемай у невялікім калектыве, замкнёнай прасторы і пры адсутнасці сувязі са знешнім светам. У такім выпадку застаецца толькі ісці да айсберга і яму скардзіцца на калегу...

Між іншым, паводле сусветнай статыстыкі, толькі ад 25 да 35 працэнтаў палярнікаў вяртаюцца ў Антарктыду зноў. У нас жа гэты паказчык перавышае 50 працэнтаў. І «лаўка запасных» з навуковых і тэхнічных спецыялістаў можа забяспечыць як мінімум дзве-тры круглагадовыя экспедыцыі.

У папярэднім сезоне ў Антарктыду быў дастаўлены, сабраны і апрабаваны ў розных рэжымах новы комплекс дызель-электрастанцыі, разлічаны на работу ва ўмовах зімоўкі. У другім аб'екце станцыі змантыравана пяць секцый з васьмі. Цяпер на парадку дня амбулаторна-хірургічная, лабараторная і жылая секцыі. І зусім невыпадкова ў апошнія экспедыцыі ўключалі ўрачоў — перш чым адправіцца на зімоўку, трэба ацаніць свае сілы... Медыцынскі блок аснашчаны самым сучасным абсталяваннем, якому медыкі на Вялікай зямлі пазайздросцілі б, але ўсе спадзяюцца, што ім не давядзецца карыстацца.

— Першая зімоўка павінна стаць пілотнай. Трэба пратэсціраваць усе сістэмы жыццезабеспячэння і бяспекі, затым вярнуцца на паўгода на Вялікую зямлю і зрабіць работу над памылкамі. І толькі пасля гэтага пераходзіць да пастаяннага круглагадзічнага цыкла, напаўняючы станцыю сур'ёзнымі навуковымі праграмамі, — падкрэслівае Аляксей Гайдашоў.

Падчас 12-й экспедыцыі яе ўдзельнікі выканаюць вялікі аб'ём работ па адборы проб і ўзораў прыродных матэрыялаў Антарктыкі, гідрахімічныя, біялагічныя, экалагічныя даследаванні наземных, марскіх і прэснаводных экасістэм Антарктыкі, правядуць маніторынг азонавага слоя атмасферы і УФ-радыяцыі, геафізічны маніторынг, даследуюць змяненні прыроднага асяроддзя і клімату. Акрамя гэтага, узмацняецца міжнародная навуковая кааперацыя. Павел Шаблыка будзе працаваць у складзе Балгарскай экспедыцыі ў Заходняй Антарктыдзе, а Сяргей Какарэка — у складзе Турэцкай сезоннай антарктычнай экспедыцыі. Для таго каб канчаткова замацавацца на ледзяным кантыненце, патрабуюцца сур'ёзныя вынікі навуковых даследаванняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Сокольская, микрорайон «Заболоть») 10 декабря 2019 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок * | Ул. Сокольская, в районе жилого дома № 9 | 0,0991 | 440100000001001794 | 3 471,62 | 41 364,07 | 8 200 |
| 2 | Земельный участок У-406* | Микрорайон «Заболоть» | 0,0975 | 440100000002008165 | - | 16 716,68 | 3 200 |

* – Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 10 декабря 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;
заявление на участие в аукционе установленной формы;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
дополнительно представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 11 ноября по 4 декабря 2019 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;
внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.
Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальные сайты организатора торгов www.grodno.gov.by, gcn.by**



## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91»

**Лот № 1**: МАЗ 5337 А2 ПМС 328Д, кузов № Y3M5337A280001322. Начальная цена с НДС – 61 864,80 бел. руб. Задаток – 12 372,96 бел. руб. Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 17.
**Лот № 2**: Склад агрегатов, инв. № 500/D-708015515, площадь – 199,4 кв. м.
Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 15А, пом. 9. Обременение: аренда (перечень договоров аренды на сайте Организатора аукциона ino.by).
**Начальная цена с НДС – 50 826,00 бел. руб.** Задаток – 10 165,20 бел. руб.
Кап. строение с инв. № 500/С-29007, в котором расположено изолированное помещение с инв. № 500/D-708015515, расположено на земельном участке площадью 0,2817 га с кадастровым номером 500000000004006413. Право аренды по 30.04.2028. Доля: 471/500

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи Лотов в течение 5 (пяти) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов): предоплата 100 % стоимости Лота (Лотов). 3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан осуществить регистрацию перехода прав на приобретенное имуществ за счет собственных средств. 4. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 5 % (пяти процентов) от цены продажи каждого Лота в течение 3 (трех) банковских дней со дня проведения аукциона. 5. К Победителю аукциона (Претенденту на покупку) по Лоту № 2 переходит 0,942 доли в праве аренды земельного участка с кадастровым номером 500000000004006413

**Аукцион состоится 10.12.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ N 91», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11/7, тел. 8 (017) 251 63 32.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 10.12.2019 (ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91», Лот №__).
